ДУБРОЎСКІ НАСТРОЙ

#106

ЛЮТЫ 2008

НАРОДНЫ БАЯВЫ ЛІСТОК ДУБРОВА ПАРЫЦКІ ПАВЕТ

Спакойна і па-савецку стабільна мінае жыццё дуброўцаў. Каму трэба, той ідзе на пенсію, каму прыходзіць час, той ідзе на той сьвет. Каму рана і туды і туды- той ходзіць на працу ў дзяржаўную латыфундыю.

Адмыслова ўкамплектаваная мясцовая ўлада час ад часу дэманструе сваю нікчэмнасьць і непатрэбнасьць.

Пераложныя бальшавікі і пасьля юрыдычнага скону яскрава дэманструюць жыццёва сьць сваіх злачынных планаў.

Шпарка зьнікаюць вёскі, некалі абвешчаныя камуністычным збродам «неперспектыўнымі». Практычна нежылы Церабулін, бульдозерам раўнаецца некалі даўжынёю з кіламетру Вялікі Бор... «Зьнікаеш, вёска, з яснай явы» як загадкава напісаў некалі Янка Купала.

У Дуброве практычна не раджаюцца дзеці, у наваколлі яны даўно перасталі зьяўляцца на сьвет. Добра, што шчэ раз- пораз гукаюцца сьвіння ды з-пад пугі бегаюць каровы.

Ды шчэ ад студзеня выюць каты, якіх кліматычныя зьмены зьбілі з панталыку і парушылі біялагічны гадзіннік.

Цалкам верагодна, што перанняўшы людзкую мадэль паводзін свойскія жывёлы таксама спыняць рэпрадукцыю.

Канешне, канешне, нельга не згадаць новую галіну гаспадаркі: збор членскіх складак з сяброў тутэйшай БРСМ. Хто не працуе аддае чорту лысаму 500 руб, хто працуе, адпаведна, болей. Аказваецца, дурасьць бывае платнай.

Для тых, хто чытае наш лісток далёка ад Радзімы, паведамім: так, гурток Аматараў Ранішняга Айчыннага Пойла па-ранейшаму ладзіць штодзённыя набажэнствы ля кульбяшоў ля манапольки.

Сьнегу ў нас сёлета была адна капля. Сьнег, па рашэнню Прэзідэнта быў заменены дажджом, так танней і хутней

Перад самым Новым годам лясьнікі атрымалі загад варта ваць лес 24 гадзіны ў суткі, каб хто не ўкраў ялінку дзеля паганскага сьвяткавання Новага году. Канешне, зьнішчыць дрэва каб праз тры дні пасьля сьвята выкінуць на сьметнік- гэта дзікасьць, але і загад трохі дзіўны. То калі ў лесі стрэнеце зьдзічэлага мужыка, магчыма, гэта і ёсьць звышпільны лясьнік, што захрас у перадсьвяточнай варце.

А перад гэтым наша родная ўлада датэрмінова адабрала ў народа ільготы, яшчэ 15 сьнежня, хоць раней казала, што халява скончыцца з першага студзеня.

Але ж у нас прывыклі перавуконуваць планы.

З адной дуброўкай здарыўся канфуз. Паехала баба ў наша павятовае мястэчка пасажыркаю, улезла ў яе і кажа шахвёру: Не забудзься, у мяне ільгота. Шахвёр заіржаў, як жарабец і кажа бабе: Ты ета Рыгоравічу скажы. Баба ў адказ: Дак ён жа памёр. Аказваецца, яны мелі на ўвазе розных Рыгоравічаў. Толькі дзякуючы асьветнай працы шафёра баба ўцяміла, што яе трохі абакралі і цяперака, па ейных словах, яна спраўна і штодня кляне рыгоравіча і дужа абураецца ягонаму каварству.

Што тут абурацца!? Да шаптух трэ зьвяртацца! Хай на шэпчуць пераложным ворагам народа разунку і асцу.

І, вядома ж, далёка не ўсім дуброўцам пашэндзіла паша раваць натруджныя целы перад рознымі санкцыянаванымі сьвятамі. Усе цьвенькаюць пра нейкія мыйныя ўстановы, але, як бачаць мурзатыя жыхары, багата сродкаў знаходзяць на рамонт усяго, акрамя як аб"ектаў сацыяльнай сферы.

Неяк абыякава стракае народ надыход эрзац камунізму, г. зв. аграмястэчак. Краіна і Дуброва захрасьлі ў маразьме.

ПРАГРЭС

Усё большае змычка між горадам і «вёскай», як пра тое марылі протабальшавікі: усім рабочым «Дубровы-Агры» далі сьпецвопратку: куртку з сьвятлаадбівальнымі палосамі ды чаравікі. Нават Аляксандр Паўлаў Цярэшчанка хваліўся суседу навучыцелю, што хоць ён і працуе на паўстаўкі, але і яму далі. Сусед добра прылабунюваўся, каб танней купіць гэную антыміліцыйную апратку з флікерам, але Цярэшка з абурэннем адрынуў недарэчную прапанову.

Цяперака натоўп механізатараў, што йдзе па палучку, пэўна, будзе выглядаць зусім шляхетна, а не быць падобным на гурт шэрай люмпенізаванай маргіналізаванай масы з змрочнымі тварамі.

Але ўсёроўна да заходніх стандартаў нам далекавата.

Неяк па тэлевізары давялося пабачыць італьянскіх сельскіх парабкаў. Каб не подпіс на экране, нізавошта не паверылася б, што гэта людзі аднаго сацыяльнага пласту з дуброўскім людам: чыстыя гожыя твары, ахайная вопратка, ніякага намёку на прыгнёт альбо эксплуатацыю. От табе і сельская праца.

Канешне, добра, што трошкі сродкаў укладзена ў ахову працы і жыцця працоўных. Але як далёка да сапраўднага вырашэння шматлікіх вясковых праблем.

Ды мо й позна іх вырашаць альтруістычнымі метадамі.

Друкарня імя І. Масьціцкага. 100 асобн.

БАІЦЦА.

Наглядзеўшыся пужалак па тэлевізарах пра расейскія «даброты» дуброўскія бабы, асабліва трэцяга і чацьвёртага веку, пачалі надта баяцца таго, што і ў Беларусі ўвядуць цалкам платныя медычныя паслугі. Такія паслугі нідзе не выклікаюць энтузіязму, але пры нашай «заможнасьці» гэта асабліва палохае людзей.

Што тут сказаць? Гэныя бабы дужа кахаюць беларускага дыктатара, дыктатар увесь час за плячыма народу цануецца з фашыстам Пуціным наконт продажу Беларусі Расеі. І калі Расея здолее купіць дыктатара з вантробамі і шлуннем, то не пасьпеюць бабу і вокам міргнуць, як прагны расейскі драпежнік прынясе бабам і ўсяму народу свае каланіяльныя «выгоды».

Дык і бабам і ўсяму народу трэба крэпенька трымацца за сваю незалежную Беларусь, а не пужацца чужымі страхамі. Ды й пакумекаць пара, як бы скінуць дыктатара і зажыць годна, не баючыся сваёй беднасьці і зусім пазбыўшыся яе.

А калі ты тупы і не любіш палітыкі, то хоць бы ўзгадай народную мудрасьць:

у сваёй хатцы хоць усрацца.

І яшчэ адна парада: адцурайцеся ад сатаны ў хаце- тэлевізара. Схадзіце, як колісь нашыя бацькі, да суседа, запаліце лучыну на комінку і пагаманіце пра звычнае і сваё, успомніце тых, хто не з намі, сваякоў. Раскажыце ўнукам пра мінуўшчыну і калгасны прыгнёт. І сьпіце спакойна.

ЗАБРАЛІ Ў КАМСАМОЛ.

Як і пры пераложных камуністах беларуская нацыя спраўна плаціць таталітарнаму рэжыму даніну моладдзю. Пасьля чарговага прызыву і ў дуброўскай школе мабільных тэлефончыкаў некалькі падлеткаў-тынэйджараў папоўнілі шарэнгі і зараз спраўна плоцяць складкі.

Адзін бацька дужа абураўся, што сын палез у той БРСМ.

Сербануўшы з рыльца, мужык жаліўся: «Я яму і кажу: я ўсю жысь быў супраць гэнага трупа {Леніна, што тырчыць на білеце}, а ты палез да яго. Няўжо ў Беларусі так трэба той труп? »

Згон тынэйджараў у фашысталюбны БРСМ сьведчыць пра адсутнасьць маральнага грунту ў падлеткаў, дэманструе, чаго варта таталітарна дзяржаўная адукацыя. Асабліва агідная роля ў служанак рэжыму, школьных настаўніц-фашыстутак, якія з-за страху і з-за бязмозгласьці страцілі ўсё грамадзянскае пачуццё прыстойнасьці і пасервілісцку ўстаньчаюць самай вычварнай прыхамаці монстраў пры адукацыі.

Гэта пра такіх за савецкімі часамі хадзіў вершык:

«Слоўна цень стаіт ацец
Маць па дому мечацца
Дочку ўзялі ў камсамол
А яна- мянетчыца».

Стаць «мянетчыцай» нескладана: дастаткова ўзяць картку з выявай трупа і заплаціць 500 нацыянальных грошай. (раней зваліся «зайчыкамі»)

НОВАЕ ДАСЯГНЕННЕ АРЦЕЛІ.

Новая шатровая страха з бляхі, палуджанай пластмасаю, зьявілася на калгаснай канторы.

Праца вялася з парушэннем правілаў бясьпекі: месца не было адгароджана аніякаю стужкаю ці плотам.

Паставіўшы тую рудую страху работнікі скідалі дадолу ранейшае покрыва - рубероід і зямлю- прама каля ўваходу на пошту, ды так, што туды сташна было зайсьці. Ніякіх брылёў ці агароджы не паставілі.Пыл ахінаў усё. Абураныя грамадзяне выказвалі сваё незадавальненне і калгасным начальнікам і іньсьпекцыі па будоўлі ў Шацілках, але на нязручнасьці людзей ніхто не шманаў.

Зараз кантору, бы ляльку, кутаюць у шкловату, а потым нечым пакрыюць.

Увосень пад канторай збудавалі мікракацельню на адзін бак, якую ўдзень нацыянальным палівам - дрыўмі- паліць сп. Палазьнік Ігар. Нанач уключаюць электрычны кацёл.

«Гомлюдрэўэнерга» нікуды не дзецца ад навязанай зьверху змычкі сельскай латыфундыі і электрыфікацыі ўсёй краіны. Гэта як па прымаўцы: дзеці - пакуль вырастуць, а ўнучкі- пажыццёва. Вось ён, новы рэцэпт камунізьму, то бок спрытнага падману і абкрадання народу.

Вось такія зімовыя посьпехі і дасягненні нашай дарагой арцелі.

ШКОЛАМ І ЎСТАНОВАМ АДУКАЦЫІ СПУШЧАНЫ НОВЫ ПРАМФІНПЛАН.

Новы, палепшаны, прамфінплан спушчаны аддзелам адукацыі. Дзіцячыя садкі ды школы мусяць зарабіць хто мільён рублёў, хто тры мільёны, а хто і меней. Маразмам і дурасьцю можна назваць гэткае ўказанне. У багата якіх школах цячэ страха. Таксама ў Дуброўскай школе па класах і ў настаўніцкім пакоі на падлозе стаяць міскі, тазікі і чаропкі. Але хіба назьбіраеш «Гомельэнергаў» на ўсіх?!

От ужэ гадоў дваццаць, як школам не даюць абсталявання ў фізічныя ды хімічныя лабалаторыі Настаўнікам цяжка паказаць эксперымент і досьлед. Дзяржава пакрысе цураецца адукацыі, але спраўна памятае, што вучняў трэба загнаць у акцябраты!- піянеры-БРСМ, задурыць мазгі брудам ідэалогіі. Адукацыя ўсё болей з маўклівай згоды грамадзян робіцца платнай. Зрэшты, якія грамадзяне? Наёмныя люмпены, спажыўцы таннага беспароднага пойла, аўтаматычныя галасавальнікі - у гэткі натоўп ператварыў рэжым ладную частку нашага добрага народу.

Што рабіць дырэктарам?

Стаць хто з шапкай, хто з хустаю ў руках і прасіць міласьціну.

А мо варта было б і бацькам выказаць свой пратэст чыноўнікам, што страцілі разважны розум?

АДКРЫЦЦЁ АМЕРЫКІ

Дабіўшы «неперспектыўную вёску» і не маючы асаблівых спадзяванняў на размнажэнне народу і не верачы ў моц легендарных нацыянальных геніталіяў рэжым дзелавіта шукае акупантаў на нашыя землі.

От і нядаўна адзін высокапародны чыноўнік з Беларусі наведваючы брацкую Венесуэлу крычаў і галёкаў нацыянальны лозунг «жыву ў Беларусі і тым, тваю маць, ганаруся» і прапаноўваў венесуэльцам перасяляцца ў беларускія аграмястэчкі. Ну і хітрун!

Хоча скарыстаць тое, што тамтэйшыя індзейцы і крэолы не ведаюць нашага беларускага жыцця і, як мушкі на каўляш, рынуцца за акіян узьнімаць мёртвыя вёскі і кароўнікі з праху і пылу. Гэта трошкі нагадвае вярбоўку ў рабы, бо менавіта так выявілі сябе калхозы ў дачыненні да сялян.

Лепей бы нашыя чыноўнікі ехалі ў Ізраіль ды манілі сюды тамтэйшых арабаў. Як бачыш аслабла б напружанасьць у кібуцах і ў Эрэц Ізраэль, а таксама ў палосе Газы.

Угачавэсы! Купіце нашага дыктатара сабе! У вас будзе два найлепшых у сьвеце!

РАДЫЁ СВАБОДА? ТАК, ВЯДОМА!

Кароткія хвалі
06.00-08.00 49 і 41 м
18.00-20.00 31 і 25 м
22.00-24.00 41 і 31 м
20.00- 22.00 31м
Сярэднія хвалі - 490 м

Нашашэр вушы і слухай
Будзь паінфармаваны.

НІХТО НЕ ЗАБЫТЫ?

11. 01.08.ПАМЁР АПОШНІ КАРЭННЫ ДУБРОВЕЦ-ВЕТЭРАН ДРУГОЙ СУСЬВЕТНАЙ ВАЙНЫ.

Васіль Сушкоў зімаваў у Шацілках у дачкі, але, прадчуваючы канец жыцця, папрасіў прывезьці яго дадому, каб памерці дома. Тут ён і памёр праз дзень. Хай яму будзе пухам родная зямля.

Пахавалі яго сьціпла. У раённай газетцы быў выдрыкаваны на маскальскай мове ладны матэрыял пра яго, пісаны сп. Людмілай Бусел, нашай біліятэкаркай.

Сёй-той мяркуе, што хаваць апошняга дуброўскага ветэрана мусілі б з салдатамі, каб тыя бабахнулі з ружжаў у паветра, аддалі б вайсковую пашану чалавеку й гісторыі. Але ў ваенкамаці, пэўне, думаюць болей пра выпіўку і закусь, чым пра гонар Айчыны. Меркулаўская раённая ідэалагічная інквізіцыя таксама занятая хранічным ананізмам і пажыраннем халяўных буджэтных грошай.

САМЫ АПОШНІ

Застаўся ў Дуброві яшчэ адзін ветэран Страшнай вайны- 90 гадовы таварыскі дзед Дзям"ян Краўчанка, майстар зрабіць саматужкі, граблі, кашы, зусім слабы і нямоглы. Яго забралі з Брагіна сын і нявестка і прыглядаюць старога.

ПАШКАДАВАЎ ЛІТАСЬЦІ.

З-за цяжкай хваробы у цяжкае становішча патрапіў неблагі дуброўскі мужык М.Д. Ягоны сын папрасіў дапамогі ў калгасі, але сп. Доўгі М,, нейкі калгасны начальнік дужа забаяўся,параіўся з прафсаюзам, але як там дазналіся, што мужчына не сябар, то наадрэз адмовілі.

ПРАЯВІЎ ГУМАНІЗМ.

Тады сп. Зьміцер Атрошчанка, дырэктар арцелі, распарадзіўся даць чалавеку помач, чым выявіў сябе як гуманны і міласьлівы кіраўнік.

ВЫСНОВА

Сп. Доўгі М. адсталы чалавек і прапашчая душа. А прафсаюз - кака.

ПАВЫПУСКАЛІ ПАЛІТЗЭКАЎ.

Як беларускага дыктатара прыперла, то ён распарадзіўся павыпускаць палітычных вязьняў. Хлопцы тыя атрымалі гады за палітычную дзейнасьць, сядзелі, лічы, ні за што. Але аднаго зэка ён упарта не выпускае, хоць і рад бы. Гэта Аляксандра Казуліна, былога кандыдата ў прэзідэнты, які патэлевізары пытаў дыктатара: «Дзе грошы, Аляксандр?». Выпусьцілі яго толькі на трое сутак на пахаванне жонкі Ірыны, прыгожай і разумнай жанчыны, пасьля таго, як людзі пачалі абурацца бесчалавечнасьцю дыктатара , а дочкі заявілі, што без бацькі маці хаваць не будуць.

Пасьля пахавання сьмелы Казулін вярнуўся на зону.

А мы патрабуем

«СВАБОДУ АЛЯКСАНДРУ КАЗУЛІНУ!»

«ШЫЗАФРЭНІЯ»-

так назвалі маскоўскія выбары прэзідэнта французкія газеты. Пра якія выбары можна казаць, калі даўно, як у Англіі, вядома, хто стане наступным царом?Па тэлевізары на здаравенным плакаце красавалася «салодкая парачка», два жанатыя сінякі, якія «разам адужаюць». Цяпер у Расеі як у Беларусі: «разам жывом- разам душым нязгодных». Крамлёўская мафія пакуль што выйграла.

ВЫБАРЫ ЎВОСЕНЬ

На канец верасьня будуць прызначаныя чарговыя выбары ў Палату Прадстаўнікоў.

Зараз там ад вашага імя сядзіць Валянціна Кавалёва, былая навучыцельніца рускаго языка шацілкаўскаго акцэнту.

Кажуць, што яна майстар сказаць самую бяздарную прамову. Болей мы яе не бачылі і не чулі.

Памятайце: пры дыктатуры г. зв. парламент не мае ніякай самастойнасьці і служыць то посьцілкай, то подсьцілкай рэжыму, бо трапляюць туды адны халуі.

А галасуюць за гэных воблаў толькі бабы-кухвайкі і апалітычныя мужчыны сярэдняга веку. Таму і ўлада такая: апалітычная кухвайка. На гора нам усім.

У далекім канадзкім слаўным горадзе ТАРОНТА пайшоў з жыцця добры беларус, шчыры нацыяналіст-патрыёт беларускі пісьменнік

КАСТУСЬ АКУЛА

(Аляксандр Качан)

Ён багата зрабіў для беларускай справы. Таксама і з ягоных сродкаў друкаваўся і пашыраўся наш лісток.

Хай яму будзе пухам канадзкая зямелька

Самаахвотна пайшоў з жыцця добры беларус, калгасны электрык

ШЧЭРБІН

ВІКТАР МІКАЛАЕЎ

Пэўне, меў цяжкасьці з жыццём.

Хай яму мяккай будзе зямля

Пасьля цяжкай хваробы пайшла ад нас

ПРЭДЧАНКА

КАЦЯРЫНА АНАТОЛЕВА, чарнобыльская ўцякачка

Хай Гасподзь прыгорне яе сваёй ласкай. Спачуванне дачцэ, унукам, зяцю.